# Чароўнае слова

*Міхась Даніленка*

Ста́сікаў бацька працуе трактарыстам. Цяпер, як пачалася касаві́ца [1], яго трактар цягне па лузе счэп касілак. Яны стракочуць і пакідаюць за сабой шырокую паласу выкашанай травы. Стасік, які прынёс бацьку абед, сядзіць пад кустом у цяньку і адмахваецца ад аваднёў. Яны злосна гудуць ля хлопчыка, кру́цяцца — спрабуюць укусіць за руку, за потную шчаку. Хутчэй бы бацька ішоў!

А той робіць новы круг, праязджае паўз сына і прыветліва махае рукой.

— Ці скора, татка? — стара́ючыся перакрычаць шум матора, гукае Стасік.

— Скора, сын! Скора.

— Дранікі і боршч астынуць, — гаворыць Стасік. — А мама наказвала, каб абед адразу еў.

Нарэшце, зрабіўшы яшчэ адзін круг, бацька спыняе трактар. Ён сыходзіць з машыны, выцірае потны лоб і спяшаецца ў цянёк да куста крушы́ны, дзе чакае Стасік.

— Стаміўся? — пытаецца Стасік.

— Стаміўся, — прызнаецца бацька. — Ды я, брат, знаю чароўнае слова. Яно як рукой стому здымае.

Стасік усхопліваецца, садзіцца на кукішкі і здзіўлена глядзіць на бацьку.

— А што ж гэта за слова такое?

Бацька з апетытам сёрбае боршч. Запівае дранікі малаком і, як на дарослага, глядзіць на сына.

— А слова тое чароўнае — «трэба». Я вось ведаю: трэба скасіць усю дзялянку. Сам зараз падрамлю трохі. А ты павартуй, паглядзі, каб ніхто да машыны не падыходзіў.

Сон зморвае і Стасіка, хіліцца да каленяў галава. Але ён не спіць: помніць бацькава чароўнае слова.

---

[1] *Касаві́ца* — час пакосу травы.